*Н.В. Петухова*

# ДА ПРАБЛЕМЫ АКТУАЛІЗАЦЫІ ТРАДЫЦЫЙНАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў ДЗЕЙНАСЦІ АМАТАРСКІХ ФАЛЬКЛОРНЫХ КАЛЕКТЫВАЎ

Далучэнне нашай краіны да сусветнай інфармацыйна-культурнай прасторы не толькі пашырае межы традыцыйнай народнай культуры, але і падштурхоўвае моладзь да пераймання ўзораў іншых культур, што ў пэўным часе можа пагражаць размываннем «культурнага ядра» нацыі. Гэта акалічнасць актуалізуе патрэбу ў трансляцыі і папулярызацыі сярод моладзі традыцыйнай народнай культуры, найболей з якой кроўна звязаны пачуцці нацыянальнай бацькоўскай спадчыны, годнасці, шанавання сваіх вытокаў, каранёў.

Значнае месца ў абуджэнні гістарычнай памяці надаецца аматарскім фальклорным калектывам (А. М. Аляхновіч, І. М. Грамовіч, В. В. Калацэй, А. М. Козенка, Л. Л. Ражкова, Л. В. Снапкова, Л. В. Шаміна і інш.).

Аднак гэтая практыка ў сучасных аматарскіх фальклорных калектывах мае свае асаблівасці. Яна істотна адрозніваецца ад існуючай у этна-аўтэнтычных (вясковых) фальклорных гуртах, дзе вучэбна-творчая дзейнасць не выдзяляецца з жыцця, арганічна спалучаецца з бытам і адпачынкам, каляндарнымі і сямейна-бытавымі святамі, а засваенне фальклору адбываецца традыцыйнымі спосабамі далучэння асобы да народнага мастацтва – з «вуснаў у вусны», ад старэйшага да малодшага. Творчасць такіх калектываў носіць імправізацыйна-варыятыўны характар.

У адрозненне ад этна-аўтэнтычнага фальклорнага гурту, для якога характэрна натуральнае, жывое бытаванне фальклору ў пэўнай штодзённай рэчаіснасці і прыродным асяроддзі (Жніво – на полі, Купалле – ноччу, на ўлонні квітнеючай прыроды), кірунак мастацкай творчасці ўдзельнікаў аматарскага фальклорнага калектыву ўяўляе сабой аднаўленне фальклорнай спадчыны ў другасных, не аўтэнтычных, пераважна сцэнічных умовах. Таму дзейнасць аматарскіх фальклорных калектываў «у адрозненне ад дзейнасці традыцыйнага фальклорнага гурту працякае ў межах не фальклору, а фалькларызму» [2, с.43].

Фалькларызм – гэта з’ява сучаснай мастацкай культуры, якая адлюстроўвае ўвесь спектр творчых інтэрпрэтацый фальклору.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Тэрмін «фальклярызм» быў уведзены ў навуковы абыходак французскім фальклярыстам XIX ст. П. Себіё для характарыстыкі другасных, неаўтэнтычных фальклорных з'яў (фальклор на сцэне, у мастацкай самадзейнасці, прафесійнай творчасці і інш.). Шырокае распаўсюджанне ён атрымаў ў даследаваннях 60-х гг. XX ст., што тлумачыцца навуковым асэнсаваннем масавай міграцыі вясковага насельніцтва з уласцівай яму фальклорнай культурай у гарадское асяроддзе. Такая сітуацыя своеасабліва паўплывала на існаванне і функцыянаванне фальклору, яго трансфармацыю ў межах урбанізаванай культуры, што знайшло адметнае адлюстраванне ў навуковых працах А. М. Аляхновіча, В. Е. Гусева, А. В. Захарава, І. І. Зямцоўскага, С. Ю. Няклюдава, Б. М. Пуцілава і інш.

Фальклор і фальклярызм – з'явы ўзаемазалежныя і генетычна ўзаемазвязаныя паміж сабой. Аднак новая сацыяльна-культурная рэчаіснасць, якая паўплывала на ўзнікненне фальклярызму, прывяла да істотнай трансфармацыі мастацкай стылістыкі і спосабаў трансляцыі каштоўнасцей фальклору. Так, сучасная практыка далучэння аматараў да вытокаў народнай творчасці ў большасці пабудавана на традыцыях пісьмовай культуры, у выніку – фальклор засвойваецца тым жа шляхам, што і прафесійная музыка: дамінуе канцэртная скіраванасць навучання, захапленне сцэнічна эфектным матэрыялам, гульні, песні развучваюцца па нотах і ў апрацоўках. Увесь вучэбна-выхаваўчы працэс выступае як этап творчай самарэалізацыі, і ў першую чаргу ўдасканаленне выканальніцкага майстэрства, канчатковым вынікам якога з'яўляецца стварэнне канцэртнай праграмы, разлічанай на выкананне з канцэртных пляцовак. Аднак канцэртная скіраванасць навучання мае вынікам няўвагу да спецыфікі «жывога» бытавання твораў фальклору, у якім заключаны традыцыйны сэнс выканання, і гэта вядзе да паніжэння інтарэсу аматараў да натуральнага існавання фальклору, які першапачаткова не разлічаны на выкананне на сцэне, на перадачу інфармацыі пасіўнаму слухачу. Выкананне песні ў традыцыі – гэта «спевы для сябе», якія прадугледжваюць своеасаблівую манеру, у якой немагчыма выкарыстанне «канцэртных» правіл. Больш таго, аўдыторыя на сучасных канцэртных пляцоўках таксама істотна адрозніваецца ад цеснага вясковага кола сааўтараў-саўдзельнікаў. Таму, згодна з вядомым даследчыкам Б. М. Пуцілавым, падчас выканання мастацкіх твораў фальклору не заўсёды патрэбна аўдыторыя, бо фальклор гэта не

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

канцэртная з’ява і па сваёй прыродзе ён звернуты не да гледача, а ў сярэдзіну, у фальклорнае асяроддзе [1, с.10].

Гэта дае падставы сцвярджаць, што «школа» традыцыі патрабуе беражлівых адносін і аднаўлення ў практыцы аматарскіх фальклорных калектываў. Менавіта яна найлепш дазваляе сфарміраваць адносіны аматараў да фальклору як спосабу быцця, спрыяе максімальнаму спасціжэнню фальклорнай культуры і засваенню яе каштоўнасцей.

---

1. *Путилов, Б.* К морфологии фольклорной культуры / Б. Путилов // Искусство устной традиции. Историческая морфология: к 60-летию И. И. Земцовского: сб. ст. / отв. ред. и сост. Н. Ю. Альмеева. – СПб.: Российский институт истории искусств, 2002. – С. 8–11.

2. *Ражкова, Л. Л.* Фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці падлеткаў сродкамі фальклору ў аматарскіх мастацкіх калектывах: дыс. … канд. пед. навук: 13.00.05 / Л. Л. Ражкова. – Мінск, 2007. – 145 л.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ